*Вераніка Анцілеўская*

# СУЧАСНЫЯ ДЫЯТАНІЧНЫЯ ЦЫМБАЛЫ
## *(паводле этнаграфічных экспедыцый 2011-2012 гг.)*

З дыятанічнымі цымбаламі я пазнаёмілася ў час фальклорнай экспедыцыі, якая праходзіла ў 2011 годзе, калі я навучалася на першым курсе БДУКМ. Фальклорная экспадыцыя – частка фальклорнай практыкі, уключанай ў базавы вучэбны план спецыялізацыі «Этнафоназнаўства», таму я ўдзельнічала ў ёй разам з калегамі па маёй акадэмічнай групе. У Глыбоцкім раёне Віцебскай вобл – на Беларускім Падзвінні – мы былі ўпершыню. Там студэнты спецыялізацыі «Этнафоназнаўства» пад кіраўніцтвам старшага выкладчыка Таццяны Пладуновай даследавалі традыцыйную культуру вёсак Шо, Івясь, Скрабатуны, Асінаўка, знаёміліся са спевамі, танцамі, аповедамі мясцовых жыхароў. Але музыку-цыбаліста, які і зараз іграе на дыятанічных цымбалах, знайшлі толькі ў в. Івязь. Яго завуць Васіль Філіпавіч Радзюш.



*Малюнак 1* – Музыка Васіль Філіпавіч Радзюш, в. Івязь , 2011 г.



*Малюнак 2* – Музыка Філіп Васільевіч, в. Вардамічы , 2012 г.

Мне давялося разам з калегамі па групе Мордань Дар'яй і Хальковым Мікітам пазнаёміцца з гэтым цудоўным музыкам і павучыцца ў яго. У асноўным я вучылася іграць на скрыпцы, на якой іграў даўней яго брат, але, акрамя гэтага, я звярнула ўвагу на яго цымбалы, на іх строй, знешні выгляд, на манеру, у якой ён іграў. Мяне ўвогуле зацікавіў гэты інструмент. Ён паказаў строй цымбал, найграў шмат танцаў [3].

У мінулым 2012 годзе, у летку, я ўдзельнічала ў іншай экспедыцыі, якую правадзіла СЭТ (Студэнтскае этнаграфічнае таварыства). Я ездзіла з сэтаўцамі ў Вілейскі раён Мінскай вобл, Докшыцкі і Чашніцкі раёны Віцебскай вобл. Там мне давялося сустрэцца з музыкай – Філіпам Васільевічам з в. Вардамічы, Вілейскага раёна Мінскай вобласці, які таксама мяне вучыў іграць на цымбалах. Трэба адзначыць, што ён мне прыпадаў вялікі ўрок [4].

Яго манеру ігры я адчула на сябе, калі імкнулася пераняць яе метадам дэманстратыўнай антрапатэхнікі. Спачатку мне было цяжка разабрацца ў строі, потым разабралася і як іграць мне стала ясна. Цымбалы з Вілейскага і Глыбоцкага раёнаў аналагічныя па сваёй будове, толькі былі настроены ў розных танальнасцях. З Глыбодскага раёну цымбалы мелі больш нізкую танальнасць – ля мажор, а з Вілейскага – настроены вышэй – сі мажор. У народзе музыкі кажуць, што «настрайвалі высока, ці нізка, на свой лад». Строй у іх дыятанічны (няма паўтаноў), дыяпазон у іх невялікі, прыкладна крыху больш актавы [1], у Вілейскім раёне амаль 2 актавы. Паміж высокімі і ніжнімі струнамі атрымліваецца актава, а паміж высокімі і сярэднімі струнамі атрымліваецца квінта.

Дэка ў цымбал вельмі гучная, зробленая з натуральнага дрэва цвёрдай пароды. Верхняя дэка рабілася з елкі, якая мела дробныя слаі. Усё астатняе выраблялася з клёну, дубу, буку, межаватай бярозы, бярозы-чачоткі [2]. Цымбалы самаробныя, у Вілейскім раёне жыў майстар, які сам вырабляў іх на продаж, у яго куплялі музычныя інструменты і музыкі з Глыбоцкага раёна. Па маім меркаванні, менавіта цымбалы яго вырабу і былі ў вёсцы Івязь, бо яны вельмі падобныя, амаль індэнтычныя. Майстар памёр прыкладна 10-15 год таму [4].

Манера ігры на гэтых цымбалах вельмі адрозніваецца. Музыка інакш трымае палачкі, ён першым пальцам іх падпірае, і вага палачак прыпадае на ўказальны палец. Рукі ў яго свабодныя, і калі палачка дакранаецца да струны цымбалаў, то ад струн яна трошкі адскоквае і атрымліваецца невялічкі прыгук, чутны абертоны. Гэтыя абертоны ўпрыгожваюць гук. Гук атрымліваецца моцны за кошт таго, што сама палачка больш даўгая і цалкам драўляная. У сучасных цымбалах палачкі троху карацей і абшыты скурай, для таго каб заглушаць гук, каб ён не быў такі рэзкі. Такую традыцыю ўвёў І.Жыновіч, ён пашырыў дыяпазон цымбалаў, на адну ноту зрабіў 3 струны, замест 5-ці, як было раней, і ўкараціў палачкі. Інакш кажучы, ён зрабіў больш акадэмічныя, храматычныя цымбалы, каб цішэй, лірычней можна было на іх іграць.

У дыятанічных цымбалах колькасць радоў струн-«галасоў» вагаецца ад 12 да 24, а струн у адной «пасме» – ад 4 да 8. У цымбалах з Вілейскага і Глыбоцкага раёна было 5 струн у адной «пасме». На дыятанічных цымбалах, пры выкананні, левая рука заўсёды ігрАла акампанемент, мелодыю іграла толькі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

правая рука. Як носьбіты казалі, што левая рука падыгрывае правай. На сучасных цымбалах, і правая, і левая рука можа іграць мелодыю. Вясковы музыка ніколі не заглушаў цымбалы. Тацавальныя найгрышы граліся заўсёды гучна, як носьбіты казалі, што яны павіны «аж гудзець, каб усім было весела». Толькі пры гучнай мелодыіі «ногі пабягуць танчыць». Полькі яшчэ больш рэзка igралі [1,2,3,4]. Таму майстры і рабілі такія інструменты, каб гучна потым граліся. Моцны гук меў вялікае значэнне ў народнай музыцы.

На мой погляд, дыятанічныя цымбалы гучаць вельмі ўзнёсла і чароўна, гэта – адмысловы ўнікальны інструмент, які трэба захаваць, увесці ў шырокі ўжытак, каб ён жыў. Па выніках экспедыцый заўважна, што на шляху захавання мясцовай традыцыі паўстае вялікая праблема: дыятанічныя цымбалы зараз амаль ніхто не вырабляе, усе старыя майстры памерлі, засталіся толькі адзінкі, сярод якіх няма моладзі. Відавочна, што трэба пашырыць выраб гэтага цудоўнага інструмента, пераняць вопыт народных музыкаў, каб традыцыя жыла. Такі адмысловы інструмент павінен жыць, і дарыць слухачам сваё непаўторнае гучанне.

**Спіс літаратуры:**

1. Скарабагатчанка, А. Беларускія народныя інструменты ХХ ст. / А. Скарабагатчанка. – Мінск : Беларус. выд-ва, 2001. – 397с.
2. Назіна, І.Д. Беларускія народныя інструменты / І.Д. Назіна. – Мінск : Беларусь, 1997. – 239 с.
3. Фонд кафедры этналогіі і фальклору : матэрыялы летняй вучэб.-паляв. фальклор.-краязн. практыкі (Віцебская вобласць, Глыбоцкі раён, вёскі: Івесь, Шо, Хралы), 2011.
4. Матэрыялы з экспедыцыі СЭТ, 2012.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ